Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.

СЕРАДА

№ 122 (29491)




КАРЭСПАНДЭНТЫ — НА ДЗЯЖУРСТВЕ З ДАІ 3




ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ІНДЫЙСКІ ШТАМ «КАРОНЫ»? 6

З першых вуснаў

# «ВЫ НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ДУХОЎНА МОЦНАГА НАРОДА»

## Пра што гаварыў Прэзідэнт выпускнікам



Фота БелТА.

**Бадай, такога россыпу ззяння сталічны выставачны цэнтр «Рамонак» не бачыў даўно. Прынамсі, з мінулага Рэспубліканскага балю выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Ззялі ўпрыгожванні і атласныя тканіны на вячэрніх сукенках дзяўчат, першыя зоркі на лейтэнанцкіх пагонах былых курсантаў, але самымі яркімі былі вочы выпускнікоў. У кагосьці яны свяціліся ад мар пра новыя поспехі, у кагосьці — ад слёз развітання з сябрамі-аднагрупнікамі. Гэта лета асаблівае для кожнага з іх — шмат чаго ўпершыню. Яны ўжо атрымалі свае першыя дыпломы, накіраванні на першае працоўнае месца, а ў дарослае жыццё іх адпраўляе асабіста кіраўнік краіны.**

Традыцыйнае мерапрыемства для найлепшых выпускнікоў у гэтым годзе складалася з дзвюх частак — афіцыйнай і нефармальнай. Першая адбылася ў Палацы Незалежнасці, дзе ўшанавалі выдатнікаў вучобы і іх педагогаў. Нефармальная частка ўяўляла сабою прыём ад імя Прэзідэнта ў выставачным цэнтры на праспекце Пераможцаў (так званым «Рамонку»). Сёлета на ўрачыстасці запрасілі амаль 280 чалавек з усёй краіны. Сярод іх — не толькі выпускнікі, але і тыя, дзякуючы каму іх поспехі сталі магчымымі, — кіраўнікі ВНУ і выкладчыкі.

«Пазіраючы на вас — такіх прыгожых, маладых і ўжо паспяховых, — я адчуваю пачуццё гонару за Беларусь (не ўсё яшчэ страчана), за тых, хто стварыў незалежную краіну, у якой нашы дзеці атрымліваюць годную адукацыю, а найлепшыя з найлепшых адзначаюць свае першыя поспехі на такім высокім узроўні. Выпадковых людзей у гэтай зале сёння няма», — пачаў сваё выступленне ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт.

Ён сказаў, што ганарыцца бацькамі прысутных выпускнікоў, якія выгадавалі выдатных людзей, педагогамі і выкладчыкамі, якія дапамаглі студэнтам знайсці сябе і, канешне, кожным з выпускнікоў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, зразумець сваё прызначэнне — гэта найскладанейшы выбар, які маладыя людзі ўжо зрабілі. «Засвоіць прафесію — вялікая праца. І вось вы ўжо трымаеце ў руках дыплом аб вышэйшай адукацыі, дыплом, аб якім вы марылі доўгія гады. Шчыра вас віншую і жадаю хутчэй пераадолець чарговую вяршыню — стаць прафесіяналам у сваёй справе, перайсці на новы ўзровень жыцця, дзе ваш рэальны статус будуць вызначаць не колькасць падпісчыкаў і лайкі, а павага людзей, у тым ліку будучых калег», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што прызнанне і павагу заслужыць магчыма толькі сумленнай і карпатлівай працай, сваёй прыстойнасцю і справядлівымі адносінамі да людзей.

«Вядома, я разумею, што атмасфера свята не схіляе да сур'ёзных размоў. Але тым не менш... Вы, яшчэ раз адзначу, сталыя асобы. Ёсць думкі, якія я як Прэзідэнт павінен данесці да вас менавіта зараз. ***Не мы выбіраем час, а час выбірае нас. У кожнага пакалення свае выклікі. Яны фарміруюць характар не толькі асобна ўзятага чалавека, але і ўсёй нацыі***, — адзначыў кіраўнік краіны. — Вам ёсць на што абаперціся. ***Вы новае пакаленне духоўна моцнага народа, які захаваў нацыянальную ідэнтычнасць, не маючы ўласнай дзяржавы на працягу стагоддзяў»***.

Прысутным Прэзідэнт нагадаў, што яны — нашчадкі герояў, якія ў страшнай вайне разам з брацкімі народамі абаранілі родную зямлю і выратавалі Еўропу ад нацызму.

«Ведаеце, многія кажуць: «Багатая краіна, бо ў яе ёсць нетры. У нетрах шмат чаго: і газ, і нафта, і золата. Багатая нацыя». Няма нічога даражэйшага за той подзвіг, які здзейснілі нашы людзі. Ён нам абышоўся неймавернай цаной — кожнага трэцяга чалавека ў сярэдзіне мінулага стагоддзя мы страцілі. Дарагая штука. І яе неабходна берагчы і ёю ганарыцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, выпускнікі могуць ганарыцца людзьмі, якія з гонарам прайшлі выпрабаванні разрухай і нявызначанасцю 90-х, сваёй працай стварылі незалежную дзяржаву і працягваюць працаваць на карысць краіны.

«Іншымі словамі, ***у вас ёсць годны і магутны, як цяпер модна гаварыць, бэкграўнд. Бэкграўнд сучаснай беларускай нацыі***. Таму беражыце дасягнутае — мір, спрадвечныя традыцыі і нашы каштоўнасці. Беражыце гісторыю, якой мы сёння па праве ганарымся», — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны папрасіў маладых людзей у цяжкія для краіны перыяды быць асцярожнымі ў меркаваннях і ўчынках, каб праз гады не было сорамна за выказванні і рэпосты, якія забудуцца, але застануцца ў інтэрнэце.

«Няхай створаны вамі ў сетках віртуальны партрэт заўсёды паказвае, што нават у гэткім юным узросце вы думалі, гаварылі, дзейнічалі правільна, па-дзяржаўнаму, як належыць сапраўдным грамадзянам сваёй краіны. Асабліва гэта датычыцца тых, хто будуе самыя амбіцыйныя планы на жыццё. Бо хто ведае, якія кабінеты і якое крэсла вы зоймеце заўтра. Хтосьці з вас будзе стаяць замест мяне на гэтым месцы, і рыхтавацца трэба да гэтага. Таму вучыцеся ў першую чаргу думаць пра будучыню краіны і беражыце свой імідж, свой твар», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што ва ўсе часы і зараз застаецца актуальнай прымаўка «Спачатку студэнт працуе на залікоўку, пасля яна — на яго». «Я вам гэта нагадаў таму, што вы сёння фарміруеце свой твар, свой імідж. Зрабіце так, каб, сфарміраваўшыся, ён заўтра працаваў на вас. І гэта будзе нармальна. І проста ведайце: калі мы, старэйшае пакаленне, кажам, што працуем на карысць Беларусі, гэта азначае — на карысць сваіх дзяцей, то-бок вас. Няма матывацыі мацнейшай за гэту. І няма нічога больш важнага, чым бачыць вас шчаслівымі», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў выпускнікам мірнага, шчаслівага і паспяховага жыцця і быць вартымі тых, хто стварыў іх будучыню.

«У вас сёння вялікі дзень. Вы будзеце памятаць яго праз гады, але гэта толькі пясчынка ў вашым жыцці. Праз некалькі гадоў вы зразумееце, што гэта нават не прыступка ў вашым жыцці, як прынята казаць. Усё наперадзе», — сцвярджае кіраўнік краіны і падкрэслівае, што самае галоўнае для кожнага з маладых — лад будучай сям'і і дзеці.

Прэзідэнт падзяліўся: сустракаючыся з выпускнікамі, узіраючыся ў іх твары, бачыць упэўненых, амбіцыйных і мэтанакіраваных людзей. Паводле яго слоў, некаторыя з іх яшчэ не пачалі працаваць, а ўжо нароўні са сваімі выкладчыкамі адзначаны высокай узнагародай.

«Няхай і ў далейшым вам заўсёды спадарожнічае поспех, а побач будуць добрыя настаўнікі. Але калі раптам у пачатку працоўнага шляху не апраўдаюцца нейкія чаканні, не спяшайцеся расчароўвацца ў абранай прафесіі. Дайце самім сабе шанец. Можа быць, не адразу, але ўсё будзе: і прызнанне заслуг, і кар'ерны рост, і матэрыяльны дабрабыт. Усё і заўсёды атрымліваецца ў людзей, якія ідуць стойка да сваёй мэты, і ў людзей, адданых сваёй справе і краіне», — мяркуе Прэзідэнт.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Паўднёвая Карэя створыць «жалезны купал» для абароны ад КНДР

Паўднёвая Карэя распрацуе сістэму для абароны сваёй інфраструктуры ад магчымага артылерыйскага ўдару з боку КНДР. Аб гэтым паведаміла агенцтва «Ронхап» са спасылкай на Адміністрацыю праграмы абаронных закупак Рэспублікі Карэя (DAPA). Па звестках ведамства, камітэт па прасоўванні абаронных праектаў на чале з міністрам абароны Са Укам ухваліў праект коштам 2,89 трыльёна вон (2,56 мільярда долараў). Яго могуць запусціць у наступным годзе і завяршыць прыкладна ў 2035-м. Вайскоўцы задумалі зрабіць аналаг ізраільскай сістэмы «Жалезны купал». Яна прызначана для выяўлення, ідэнтыфікацыі і знішчэння пагроз — ракет малой далёкасці, артылерыйскіх снарадаў і беспілотнікаў. Таксама паведамляецца, што КНДР размясціла каля тысячы артылерыйскіх гармат, у тым ліку 240-міліметровыя рэактыўныя сістэмы залпавага агню (РСЗА), уздоўж дэмаркацыйнай лініі, якая падзяляе дзве Карэі. У дадатак Пхеньян у апошнія гады не раз дэманстраваў новыя тыпы ракет.

## Бразільскіх вайскоўцаў адправяць у Амазонію для барацьбы з высечкай лясоў

Прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару падпісаў указ, які дазваляе адпраўку вайскоўцаў у Амазонію ў рамках намаганняў па барацьбе з экалагічнымі злачынствамі і незаконнай высечкай лясоў. Аб гэтым паведаміў партал G1. Прадугледжваецца накіраваць сілавікоў у штаты Амазонас, Мату-Гросу, Пара і Рандонія, дзе яны прабудуць да 31 жніўня. Узброеныя Сілы будуць дзейнічаць у каардынацыі з мясцовымі ўладам і органамі аховы навакольнага асяроддзя. Раней у маі Нацыянальны інстытут касмічных даследаванняў паведаміў, што тэмпы высечкі лясоў у бразіль-



скай Амазоніі працягваюць павялічвацца. Паводле даных анлайн-платформы арганізацыі, сёлета ў красавіку знік 581 квадратны кіламетр лясоў, што на 43 працэнты больш за аналагічны перыяд мінулага года. У сакавіку высечка лясоў склала 368 квадратных кіламетраў, у лютым — 123 квадратныя кіламетры, у студзені — 86 квадратных кіламетраў. У канцы красавіка, выступаючы на кліматычным саміце, прэзідэнт Бразіліі паабяцаў перамагчы незаконную высечку лясоў менш чым праз дзесяць гадоў.

## У Грэцыі раскрылі «крадзеж стагоддзя»



Паліцыя Грэцыі знайшла скрадзеныя больш чым дзевяць гадоў таму карціны мастакоў Пабла Пікасо і Піта Мандрыяна. Пра гэта паведаміла грэчаскае выданне «Прота Тэма». Гаворка ідзе пра творы «Жаночая галава» Пікасо і «Вятрак» Мандрыяна. Апошні быў створаны ў 1908 годзе, а карціна Пікасо была напісана ў 1939-м. Адзначаецца, што на адваротным баку палатна іспанскага абстракцыяніста ёсць рукапіснае прысвячэнне аўтара грэчаскаму народу за ўнёсак у барацьбе з нацызмам. Кошт дадзенага палатна дасягае 20 мільёнаў еўра. Абедзве карціны былі выкрадзены ў студзені 2012 года з Нацыянальнай галерэі, за дзень да яе закрыцця на капітальны рамонт. У СМІ гэта называлі «крадзяжом стагоддзя». У пошуку палотнаў удзельнічала Нацыянальная разведвальная служба. На дадзены момант вядома, што па справе аб крадзяжы твораў мастацтва затрыманы 49-гадовы грамадзянін Грэцыі. Супрацоўнікі праваахоўных органаў перашкодзілі яму вывезці палотны за мяжу для продажу на чорным рынку. Як вядома, у мінулым месяцы карціну мастака Пабла Пікасо «Жанчына, якая сядзіць каля акна» прадалі на аўкцыёне Christie's у Нью-Ёрку за 103 мільёны долараў.

ISSN 1990 - 763X

21122>

9 771990 763008

КОРАТКА

- **Дзяржузнагародамі ўганараваны 102 прадстаўнікі розных сфер дзейнасці.**
- У краіне прадоўжаны тэрмін, падчас якога можна павышаць цэны на дзіцячае харчаванне.
- **Бабруйск з 15 да 17 ліпеня прыме фестываль «Вытокі».**
- Больш за 30 тысяч паломнікаў прымуць удзел у Будслаўскім фэсце.
- **Стваральнік «Спадарожніка», дырэктар Цэнтра імя Гамалеі Аляксандр Гінцбург, лічыць, што перавакцыноўвацца ад ковіду давядзецца кожныя паўгода.**
- Гадавы курс распрацаваных лекаў ад хваробы Альцгеймера будзе каштаваць ад 56 тысяч долараў.
- **Дзень электратранспарту пройдзе ў «Вялікім камені» 16 ліпеня.**

Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ПАКАЗВАЕЦЕ ЖЫХАРОЎ ГЛЫБІНКІ, АДДАЯЦЕ НАЛЕЖНАЕ ЧАЛАВЕКУ ПРАЦЫ»

**Пётр БІЛЕЦКІ, дырэктар ААТ «Мурава» Пружанскага раёна:**

— Усёабдымная і ўсёпераможная лічбавізацыя, на першы погляд, зніжае актуальнасць друкаваных СМІ. Падаецца, нашмат прасцей і зручней у любы час дастаць свой гаджэт і атрымаць любую інфармацыю. Аднак бывае няпроста ацаніць праўдзівасць і вычарпальнасць дадзенай інфармацыі.

У гэтым сэнсе я прывык давяраць аўтарытэтным сродкам масавай інфармацыі, такім, напрыклад, як стагадовая «Звязда». У сваім даволі цесным графіку кіраўніка заўсёды знаходжу час, каб азнаёміцца са свежай друкаванай прэсай. Ваша газета ўжо шмат гадоў знаходзіцца ў падпісным пакеце нашай арганізацыі.

Варта адзначыць, што «Звязда» вельмі разнастайная па сваёй тэматыцы. Тут знойдзе для сябе прывабнае і карыснае



любы чытач. Мне як аграрыю найперш цікавыя выпускі, якія датычацца вытворчага кірунку. Ніколі не прапускаю старонкі, прысвечаныя сельскагаспадарчым прадпрыемствам, вы расказваеце пра гаспадаркі з усіх абласцей краіны. Не пакідаю па-за ўвагай артыкулы на грамадска-палітычныя тэмы. Заўсёды спыняюся на матэрыялах пра гістарычных дзеячаў і ў цэлым па гісторыі нашай краіны.

Хачу адзначыць прафесіяналізм і талент вашых журналістаў. Асабліва каштоўным падаецца, што матэрыялы яны рыхтуюць з месцаў, бываюць у глыбінцы, сустракаюцца з людзьмі, паказваюць іх на старонках. У сваёй газеце вы расказваеце нават пра аддаленыя вёскі, з матэрыялаў гучыць голас іх жыхароў, іх меркаванне. Не забываеце чалавека працы, аддаяце яму належнае ў сваіх публікацыях, за гэта мы вам і ўдзячныя. А яшчэ лічу важным падкрэсліць, што непаўторны родны каларыт любому матэрыялу «Звязды» дае якаснае беларускае слова. Адсюль цікавасць да газеты многіх і многіх людзей. Менавіта дзякуючы такім выданням, як ваша, друкаваныя СМІ не страчваюць запатрабаванасць і знаходзяць сваю аўдыторыю.

Калектыву «Звязды», з якой наша прадпрыемства звязвае шматгадовае плённае супрацоўніцтва, жадаю і далей трымаць высокую планку стылю, сучаснасць у газетнай справе ўдала спалучаць з захаваннем традыцый і досведу ранейшых пакаленняў.

# «Вы новае пакаленне духоўна моцнага народа»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён папрасіў выпускнікоў не спяшацца пакідаць сваю краіну: з'ехаць лягчэй, чым потым вярнуцца.

«На шляху стойкасці, мужнасці і цярпення хачу пажадаць вам веры ў сябе, мудрасці і ўдачы», — закончыў сваё выступленне Аляксандр Лукашэнка.

***

Прэзідэнт дадаў, што яго місія на балі — узнагародзіць найлепшых настаўнікаў і выпускнікоў, але ён упэўнены, што гэтага заслугоўваюць усе прысутныя.

Так, падзякі з рук Прэзідэнта атрымалі Алена Аўсіюк, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі і прыкладной інфарматыкі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, Людміла Бяляева, загадчык кафедры паталагічнай фізіялогіі адукацыі Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, Валерый Еднач, дацэнт кафедры сельскагаспадарчых машын Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, Андрэй Калагрыўка, дэкан факультэта горнай справы і інжынернай экалогіі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Сяргей Марзан, дацэнт кафедры матэматычнага аналізу, дыферэнцыяльных ураўненняў і дадаткаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Андрэй Мікановіч, начальнік кафедры пажарнай бяспекі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, Алена Снапкова, загадчык кафедры педагогікі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова.

За выдатныя поспехі ў вучобе і актыўную грамадскую дзейнасць Падзякі Прэзідэнта аб'яўлены таксама Вераніцы Аляшкевіч, студэнтцы курса факультэта фізікі і інфармацыйных тэхналогій Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Рыгору Голубу, слухачу шостага курса ваенна-медыцынскага інстытута ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Валерыі Гукавай, студэнтцы чацвёртага курса Інстытута кіраўнічых кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, Кацярыне Дзябёлай, студэнтцы чацвёртага курса факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Міхаілу Дзегцярэнку, студэнту пятага курса філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Андрэю Кайко, курсанту чацвёртага курса факультэта міліцыі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, Мікіту Калядзічу, студэнту чацвёртага курса факультэта фізічнага выхавання Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Максіму Коршунаву, студэнту чацвёртага курса факультэта міжнароднага права «БІП — Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій», Ілью Круку, студэнту чацвёртага курса факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, Яўгеніі Левікінай, курсантцы чацвёртага курса авіяцыйнага факультэта Ваеннай акадэміі, Марыне Маркевіч, студэнтцы пятага курса факультэта ветэрынарнай медыцыны Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, Арцёму Прыжкову, студэнту чацвёртага курса эканамічнага факультэта электрасувязі Беларускага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, Марыі Салаўёвай, студэнтцы пятага курса факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Уладзіславу Сіняўскаму, студэнту пятага курса факультэта тэхналогій арганічных рэчываў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Выпускнікі ўзялі слова ў адказ. Яны падзякавалі Прэзідэнту за падтрымку і давер, магчымасці, што адкрываюцца для іх. «Абяцаем вам, што выпускнікі 2021 года прыкладуць усе сілы і будуць далей захоўваць і развіваць свабодную і моцную краіну, несці адказнасць за яе дабрабыт у імя гістарычнага мінулага, стабільнай сучаснасці і светлай будучыні», — казалі яны. Прадстаўнікі выпускнікоў падзякавалі таксама за заснаванне Дня моладзі і студэнцтва, што, па іх словах, павысіць статус студэнцтва і яго ролю ў грамадстве.

Святочны вечар працягнуўся ў нефармальнай абстаноўцы выставачнага комплексу «Рамонак», дзе ўдзельнікаў балю чакала святочная вячэра з выступленнем артыстаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Аб'ядноўваць намаганні супраць пагроз

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з сакратаром Савета Бяспекі Расіі Мікалаем Патрушавым. На сустрэчы таксама прысутнічаў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі нашай краіны Аляксандр Вальфовіч.**

Мікалай Патрушаў знаходзіцца ў Мінску з афіцыйным візітам з 29 да 30 чэрвеня. Учора адбыліся двухбаковыя кансультацыі апаратаў саўбезаў Беларусі і Расіі. На парадку дня былі два пытанні — супрацьдзеянне гібрыднаму ўздзеянню на краіны і абмеркаванне пытанняў міжнароднай бяспекі. Таксама ў праграме візіту — сустрэча Мікалая Патрушава з беларускім калегам Аляксандрам Вальфовічам.

Прэзідэнт адзначыў, што ўважліва назіраў за выступленнямі і заявамі Мікалая Патрушава. І яны абсалютна супадаюць з поглядамі Аляксандра Лукашэнкі і айчынных спецыялістаў на падзеі ў Беларусі.

«Я вельмі рады, што вы ў тэме, паглыблены ў гэтую праблему. Я спецыяльна хацеў паразмаўляць з вамі сам-насам. Ёсць пытанні, якія пакуль нельга агучваць публічна. Але я хацеў бы, каб вы пра іх ведалі, таму што, верагодна, прыйдзецца працаваць і супрацьдзейнічаць па нейкіх кірунках разам», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, візіт Мікалая Патрушава актуальны ў кантэксце не толькі пытанняў бяспекі краін — ёсць што абмеркаваць і па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, якому Аляксандр Лукашэнка апошнім часам удзяляў асаблівую ўвагу.

«Неабходна ведаць больш дакладна, як мы будзем супрацоўнічаць па некаторых канкрэтных кірунках. Думаю, што падзелімся з вамі інфармацыяй па найважнейшых пытаннях не толькі для Беларусі і Расіі, але і асобна для Беларусі, і асобна для Расіі, асабліва ў святле апошніх яскравых падзей, тых фактаў, якія абмяркоўваюцца ў сродках масавай інфармацыі», — дадаў кіраўнік краіны.

Мікалай Патрушаў адзначыў, што кансультацыі паміж апаратамі Саветаў бяспекі праходзяць рэгулярна. І ў дадзеным выпадку яны таксама планавыя.

«Мы будзем размаўляць пра гібрыдныя войны, пра рэгіянальную, міжнародную бяспеку, абстаноўку, якая складваецца вакол нашых краін. І, безумоўна, усё залежыць не толькі ад таго, што ў нас унутры краін адбываецца, а ад таго, якія сілы ўздзейнічаюць звонку», — падкрэслівае сакратар Савета бяспекі Расіі.

Паводле яго слоў, ёсць пагрозы і выклікі традыцыйныя (напрыклад, міжнародны тэрарызм, звязаны з ім экстрэмізм) і новыя (гэта кібератакі).

«На жаль, не разумеюць многія, што ніводная краіна не можа справіцца з гэтай пагрозай самастойна. Неабходна аб'ядноўваць намаганні. Будзем гэтую тэму развіваць і тлумачыць», — паведаміў Мікалай Патрушаў і выказаў меркаванне, што кансультацыі ў Мінску пройдуць паспяхова.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ Каментарый у тэму

У размове з журналістамі Мікалай Патрушаў заявіў, што яго ацэнкі падзей у сферы бяспекі супадаюць з меркаваннем Прэзідэнта Беларусі.

«І мы, безумоўна, аб'ядноўваем і будзем аб'ядноўваць намаганні ў супрацьдзеянні выклікам і пагрозам», — падкрэсліў сакратар Савета Бяспекі Расіі.

Па просьбе журналістаў ён пракаментаваў сітуацыю ў Беларусі і адзначыў, што неабходна ўдзяляць увагу ўплыву на краіну звонку.

«Я сказаў пра пагрозы інфармацыйнай бяспекі. Неабходна ўдзяляць увагу неўрадавым і некамерцыйным арганізацыям, іх дзейнасці. Калі яны кажуць, што яны незалежныя, гэта абсалютна не так. Неабходна глядзець, адкуль яны атрымліваюць фінансы і перад кім трымаюць справаздачу, як гэтыя фінансы зрасходаваныя», — упэўнены Мікалай Патрушаў.

Па яго словах, у гэтым кірунку павінны працаваць, абменьвацца інфармацыяй і праваахоўныя органы, і спецслужбы нашых краін.

«І, канешне, мы разлічваем на грамадскасць, якая таксама нам дае інфармацыю. Тады мы разумеем, якую ролю яны (арганізацыі. — **«Зв.»**) іграюць, перад кім даюць справаздачу і якой мэты хочуць дасягнуць. Калі казаць аб Беларусі, то іх канчатковая мэта — змяніць дзяржаўны лад і ўладу ў Беларусі. Гэта мы назіраем апошнія часы. А вы, хто жыве ў Беларусі, бачыце гэта больш за іншых. Аналагічная сітуацыя — уплываюць на Расію», — паведаміў Мікалай Патрушаў.

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Аляксандр Вальфовіч расказаў журналістам аб супрацоўніцтве з Расіяй.

«Вопыт у нашых расійскіх калег велізарны. Выклікі і пагрозы, рызыкі, якія характэрныя для Расійскай Федэрацыі, у поўнай меры навісаюць і над Рэспублікай Беларусь. Якраз зараз нашы апараты абмяркоўваюць гэтыя пытанні: пытанні міжнароднай бяспекі, як супрацьдзейнічаць гэтым выклікам і пагрозам, якія контрмеры прыняць», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Вальфовіч.

Гэтыя пытанні, дадаў ён, будуць абмяркоўвацца і на сустрэчы спецыялістаў. Таксама ў фокусе ўвагі — ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва.

«Работа паміж апаратамі Саветаў Бяспекі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі наладжана. Яна сістэмная», — рэзюмаваў Аляксандр Вальфовіч.

Новыя падыходы

# З УЛІКАМ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАТРЭБ

## Што прапануецца змяніць у сістэме догляду інвалідаў і пажылых

**Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях правяла пасяджэнне круглага стала, дзе абмяркоўвалася ўдасканаленне падыходаў да сістэмы догляду інвалідаў I групы і пажылых грамадзян. У прыватнасці, удзельнікі звярнулі ўвагу на пытанні замацавання новага механізму вызначэння патрэбы грамадзян у сацыяльным абслугоўванні на аснове ацэнкі індывідуальных патрэб і ўмоў жыцця, прывязкі да рэальнай патрэбы прызначаць дапамогу падчас догляду, формаў падтрымкі для тых, хто ажыццяўляе догляд, бо такія людзі часта трапляюць у пенсіённую «пастку». У пасяджэнні прынялі ўдзел члены Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях, прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства фінансаў, Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.**

### НЕ Ў ДАМАХ-ІНТЭРНАТАХ, А Ў ХАТНІХ УМОВАХ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ** адзначыла, што ў акругах да дэпутатаў грамадзяне звяртаюцца з праблемамі няпростага працэсу збору неабходных дакументаў, і надышоў час аблегчыць гэты працэс.

— Ужо сёння мы назіраем так званы феномен двайнога старэння. У першую чаргу старэюць людзі з інваліднасцю, а разам з імі тыя, хто іх даглядае. Павялічваецца працягласць жыцця, у выніку чаго становіцца больш пажылых адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян. Нам неабходна ўлічваць, што людзі, атрымліваючы сацыяльныя паслугі, прад'яўляюць новыя патрабаванні, і яны датычацца не толькі якасці і асартыменту, але і іх даступнасці. Для забеспячэння здаровага старэння нам неабходна аператыўна выяўляць вузкія месцы, якія можна спрасціць і палепшыць для чалавека пры атрыманні той ці іншай сацыяльнай паслугі. Задача на перспектыву — стварэнне магчымасці для аказання паслуг па доглядзе пажылых грамадзян і інвалідаў не ў дамах-інтэрнатах, а ў хатніх умовах, — падкрэсліла Людміла Канановіч.

### ДОМА — КАЛЯ СОТНІ ПАСЛУГ

**Начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА** расказала, што ў Беларусі пражывае амаль 1,5 мільёна пажылых людзей ва ўзросце 65+, у краіне каля 4 % людзей ва ўзросце 80+. Каля 564 тысяч чалавек мае групу інваліднасці, у тым ліку амаль 86 тысяч — I групу. Многія з іх маюць патрэбу ў староннім доглядзе — дапамозе ў правядзенні асабістай гігіены, адзяванні, прыёме ежы і іншым.

— Арганізацыя догляду пажылога чалавека — унутрысямейнае пытанне, і галоўная задача дзяржавы — стварыць умовы для выбару чалавекам і членамі яго сям'і прымальнай сістэмы догляду. Сёння сістэма догляду аб'ядноўвае паслугі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дамоў-інтэрнатаў, абслугоўванне ў замяшчальных сем'ях,а таксама выплату дапамогі па доглядзе інваліда I групы або чалавека, старэйшага за 80 гадоў. Паслугі аказваюцца як дома, так і ў стацыянарных умовах. Самай запатрабаванай формай сацыяльнага абслугоўвання і догляду ў пажылых людзей і інвалідаў з'яўляецца комплекснае сацыяльнае абслугоўванне дома, — адзначыла Таццяна Фёдарава.

Сёння такім чынам у тэрытарыяльных цэнтрах абслугоўваецца амаль 94 тысячы непрацаздольных грамадзян, 46 % з якіх — пажылыя людзі ва ўзросце, старэйшым за 80 гадоў. Колькасць атрымальнікаў надомных паслуг штогод павялічваецца — у сярэднім на 1 %. Гэта паслугі па арганізацыі харчавання, у тым ліку кармленне, аказанне дапамогі ў выкананні санітарна-гігіенічных працэдур, прыбірання жылля і шмат іншага. Тэрытарыяльныя цэнтры аказваюць пажылым людзям і інвалідам дома каля 100 паслуг. З іх палова накіравана на догляд.

Асаблівыя ўмовы абслугоўвання прызначаны адзінокім непрацаздольным грамадзянам, якія не маюць працаздольных членаў сям'і і, акрамя дзяржавы, ім дапамагчы няма каму. Малазабяспечаным адзінокім непрацаздольным грамадзянам (іх даход ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму — гэта 273 рублі) такія паслугі аказваюцца бясплатна. Летась бясплатна дома абслугоўвалася больш за 1700 непрацаздольных грамадзян. На ўмовах частковай аплаты — а гэта 60 % ад тарыфу, які ўстанаўліваюць аблвыканкамы і мінскі гарвыканкам, — паслугі атрымліваюць грамадзяне, даход якіх не перавышае 200 % БПМ (546 рублёў). На такіх умовах абслугоўваецца амаль 17 тысяч чалавек. Астатнім непрацаздольным грамадзянам (а іх большасць) сацыяльныя паслугі дома аказваюцца платна.

### 30 РУБЛЁЎ ЗА 20 ВІЗІТАЎ САЦРАБОТНІКА

Трэба сказаць, што тарыфы на сацыяльныя паслугі невысокія і не выходзяць за межы дадатковых выплат да пенсіі. Сёння за гадзіну работы сацыяльнага работніка давядзецца заплаціць ад 66 капеек (у Мінску) да 71 капейкі (у астатніх рэгіёнах). Такім чынам, кошт 20 візітаў сацыяльнага работніка ў месяц у сельскай мясцовасці — а гэта пяць візітаў на тыдзень — складае каля 30 рублёў.

З 2013 года ў нашай краіне інтэнсіўна пачалі развівацца паслугі сядзелкі. Гэта комплексная паслуга, якая ўключае знаходжанне побач з чалавекам на працягу пэўнага часу, а таксама дапамогу ў гігіенічных працэдурах і кармленні, уключаючы прыгатаванне ежы, назіранне за станам здароўя і забеспячэнне прыёму лекавых сродкаў, выкананне назначэнняў і медыцынскіх рэкамендацый. У абавязках сядзелкі — захаванне чысціні і парадку ў жыллі, камунікацыя з чалавекам, кантакт з яго блізкімі і інфармаванне аб яго стане. На паслугі сядзелкі могуць разлічваць непрацаздольныя грамадзяне, няздольныя сябе абслугоўваць і перасоўвацца. Гэтыя паслугі платныя. Частковая аплата, а гэта 60 % ад тарыфу, устаноўлена малазабяспечаным адзінокім непрацаздольным грамадзянам. Астатнія аплачваюць па поўным тарыфе. Гэта 1 рубель за гадзіну ў Мінскай вобласці, 2 рублі 76 капеек у Мінску, у астатніх рэгіёнах — 1 рубель 7 капеек. У 2020 годзе такія паслугі атрымлівала каля 3300 чалавек. Частковай аплатай паслуг карыстаўся 131 чалавек. Улічваючы важнасць такіх паслуг для пажылых людзей і інвалідаў, заканадаўства прадугледжвае вызваляць па рашэнні мясцовых органаў улады ад аплаты такіх паслуг. І летась 86 непрацаздольных грамадзян атрымлівалі паслугі сядзелкі бясплатна ў парадку выключэння.



Комплексны догляд, уключаючы медыцынскую дапамогу і сацыяльныя паслугі, аказваецца ў стацыянарных установах. Сёння гэта 92 дамы-інтэрнаты і 64 аддзяленні кругласутачнага знаходжання пры тэрытарыяльных цэнтрах. Дамы-інтэрнаты разлічаны амаль на 21 тысячу месцаў, аддзяленні кругласутачнага знаходжання — на дзве тысячы месцаў. На ўмовах поўнага дзяржзабеспячэння ў дамы-інтэрнаты пасяляюцца адзінокія непрацаздольныя грамадзяне, якія па медыцынскіх заключэннях маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе, медыцынскай дапамозе, бытавым абслугоўванні.

### НОВАЯ ФОРМА — ЗАМЯШЧАЛЬНАЯ СЯМ'Я

Новы для нашай краіны від догляду — замяшчальныя сем'і — развіваецца з 2017 года. Ён прадугледжвае сумеснае пражыванне і вядзенне агульнай гаспадаркі, прычым людзі не звязаны адносінамі сваяцкасці і паміж імі не ўстанаўліваюцца маёмасныя адносіны, не заключаюцца дагаворы пажыццёвага ўтрымання і дагаворы рэнты. Сёння ў Беларусі сацыяльным абслугоўваннем у замяшчальных сем'ях ахоплена 249 чалавек, створана 246 такіх сем'яў, прычым у 112 сем'ях памочнікам выплачваецца ўзнагароджанне па рашэнні мясцовых распарадчых органаў — у памеры бюджэту пражытковага мінімуму. Гэта людзі, якія ўзялі на сябе клопат аб інвалідах першай групы, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перасоўвання.

Як адзначае Таццяна Фёдарава, у інвалідаў першай групы і пажылых людзей запатрабаваным застаецца догляд з выплатай адпаведнай дапамогі. Гэта форма падтрымкі членаў сямей, якія страцілі магчымасць зарабляць сродкі ў сувязі з ажыццяўленнем догляду. Яна была ўведзена ў 90-х гадах мінулага стагоддзя. Сёння ў ажыццяўленні такога догляду задзейнічана каля 32 тысяч чалавек. Права на атрыманне дапамогі па доглядзе маюць непрацоўныя працаздольныя грамадзяне, якія ажыццяўляюць пастаянны догляд інваліда першай групы або пажылога чалавека, старэйшага за 80 гадоў, з наступнымі абмежаваннямі: яны не павінны быць індывідуальнымі прадпрымальнікамі, не павінны працаваць, навучацца ва ўстановах адукацыі на дзённай форме атрымання адукацыі, не павінны атрымліваць пенсію, дапамогу па беспрацоўі, штомесячныя страхавыя выплаты.

— Аналізуючы пытанні і праблемы, якія ўзнімаюцца ў зваротах грамадзян, у камунікацыі з дэпутатам, аналізуючы практыку работы, мы бачым, што канцэпцыя выплаты дапамогі па доглядзе патрабуе асучаснівання. З 2018 года міністэрства распрацоўвае новыя падыходы па вызначэнні патрэбы грамадзян у сацыяльных паслугах і доглядзе на аснове ацэнкі індывідуальных патрэб і ўмоў жыццядзейнасці. Сёлета НДІ працы распрацоўвае механізм ацэнкі такой патрэбы ў доглядзе, рыхтуюцца прапановы аб удасканаленні сістэмы догляду з выплатай дапамогі. У першую чаргу патрабуе ўдакладнення і напаўнення тэрмін «пастаянны догляд», патрабуе перагляду пытанне догляду і занятасці, а гэта працоўная дзейнасць, вучоба, самазанятасць. Неабходна знайсці іншыя формы падтрымкі тых, хто ажыццяўляе догляд, паколькі выплата дапамогі не прадугледжвае налічэння страхавога стажу і людзі часта трапляюць у пенсіённую «пастку», — звярнула ўвагу Таццяна Фёдарава.

### ПАТРЭБНАСЦЬ У ДОГЛЯДЗЕ ПЕРАГЛЕДЗЯЦЬ

**Загадчык Цэнтра даследаванняў у галіне сацыяльнай абароны НДІ працы Наталля МІЛЬКОТА** расказала пра ўкараненне механізму ацэнкі індывідуальнай патрэбнасці ў доглядзе:

— Ёсць складанасці, якія мы ўбачылі падчас даследавання. Найперш гэта аўтаматызм у прызначэнні дапамогі — няма прывязкі да рэальнай патрэбы. Выкарыстоўваецца пераважна катэгарыяльны падыход: інвалід I групы, старэйшы за 80 гадоў — значыць, маеш патрэбу. І атрымліваецца, што інвалід першай групы падпрацоўвае, але мае пастаянны догляд. Або чалавек, які ажыццяўляе догляд, афармляецца не таму, што суседу патрэбна дапамога, а таму, што трэба легалізаваць сваю дзейнасць. Якасць догляду — таксама праблема. Сёння адна з асноўных прычын спынення выплаты дапамогі — падчас маніторынгу выяўляецца, што догляду ўвогуле няма: не прыязджае чалавек, які атрымлівае дапамогу! Тут як варыянт рашэння — механізм вызначэння патрэбы.

**Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО** адзначыла, што арганізацыя арыентуецца на групу інваліднасці, але можа «падхапіць» таго чалавека, які трапіў у стык заканадаўства. Распрацавана шэсць методык догляду людзей з рознымі праблемамі, у прыватнасці з дэменцыяй, пролежневымі ранамі, вядзецца навучанне сваякоў навыкам догляду. Чырвоны Крыж атрымлівае шмат водгукаў, асабліва ад тых, хто выхоўвае дзетак-інвалідаў. Пры гэтым рэсурс грамадскай арганізацыі не дазваляе сёння прысутнічаць у кожным раёне краіны, яна прадстаўленая толькі ў 70. Медыка-сацыяльная служба «Дапамога» налічвае 153 медыцынскія сястры, каля 80 малодшых медыцынскіх сясцёр і больш за 900 валанцёраў.

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Іван ЛАЎРЫНОВІЧ** падкрэсліў, што праблема старэння насельніцтва актуальная для Беларусі, як і для іншых краін. Сёння 2474 тысячы чалавек атрымлівае пенсіі па ўзросце. Да 2030 года ў Беларусі будзе каля двух мільёнаў чалавек ва ўзросце 65+. І сістэма сацыяльнага абслугоўвання павінна ўлічваць іх патрэбы.

— У нас 20 тысяч чалавек знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах. Апошнія 5—7 гадоў да 2019-га іх колькасць расла штогод на 3—5 %. Відавочна, што тая работа, якая вядзецца, прыносіць свае плады. Але нічога не стаіць на месцы, і сістэму сацыяльнага абслугоўвання трэба трансфармаваць, пераймаючы замежны вопыт і перакладаючы яго на беларускую рэчаіснасць, — рэзюмаваў намеснік міністра.

**Алена КРАВЕЦ.**

Прыемная навіна





# ГАРАЧАЙ ВАДЗЕ ЛЕТАМ БЫЦЬ!

**У сталіцы адбылося адкрыццё лазнева-аздараўленчага комплексу «Лазня № 1» пасля рэканструкцыі, якая цягнулася амаль два гады.**

ЛАК «Лазня № 1» знаходзіцца па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 12. Лазню пабудавалі яшчэ ў 1954 годзе, і яна была разлічана на 200 месцаў. Але ў снежні 2015 года будынак прызналі аварыйным, і ў 2019-м пачалася рэканструкцыя.

Падчас рамонту будынак амаль увесь знеслі і пабудавалі на яго месцы новы, для гэтага ў падмурак прыйшлося ўвагнаць каля 600 паляў. На рэканструкцыю ЛАК выдаткавана каля 13,6 мільёна рублёў. Будынак зроблены з чырвонай клінкернай цэглы, выкладзенай па рэдкай еўрапейскай тэхналогіі. У сцяне прадугледжаны пустоты для вентыляцыі. Унутры будынка была праведзена мадэрнізацыя ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі па аказанні лазневых паслуг.

Цяпер, пасля адкрыцця, «Лазня № 1» разлічана на 157 чалавек. На першым паверсе знаходзяцца каса і гардэроб для наведвальнікаў, бар на 20 пасадачных месцаў, цырульня на адно рабочае месца, таксама працуе кантралёр, які будзе правяраць квіткі і надзяваць на запясці наведвальнікаў бранзалеты, запраграмаваныя на неабходны час. Бранзалеты будуць розных колераў — у залежнасці ад мэты наведвання: памыцца ў агульным аддзяленні, нумары «люкс» або з душавой, проста паплаваць у басейне.

На першым ярусе таксама размешчаны басейн з сучаснай сістэмай ачысткі вады. Ён абсталяваны рознакаляровай падсветкай, гідрамасажным вадаспадам, гідраўлічнай пушкай і донным масажорам для ступняў. Акваторыя басейна падзелена на тры дарожкі. А побач з ім — мужчынскія і жаночыя раздзявальні.

На другім паверсе знаходзяцца мужчынскія і жаночыя залы на 24 месцы кожная. У іх — лаўкі са штучнага каменю, купелі, фінскія і рускія парыльні і душавыя. Таксама тут абсталявалі два памяшканні класа «люкс», кожны на пяць чалавек, у якіх ёсць пакоі для адпачынку, зноў жа парыльні. У адным знаходзіцца тэрмабасейн з рознакаляровай падсветкай, дэкаратыўным вадаспадам, бакавым гідрамасажорам спіны і ступняў, у другім — джакузі.

— Вось ужо шмат гадоў добрай традыцыяй у нашай сталіцы напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адкрыццё значных сацыяльных аб'ектаў. Сёння гэта лазнева-аздараўленчы комплекс, — сказаў **кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна Сяргей ХІЛЬМАН.** Праекціроўшчыкі, будаўнікі прыклалі нямала намаганняў, працы і фактычна ўзвялі пасля непрацяглай рэканструкцыі новы будынак. Гэты, я б сказаў, унікальны аб'ект быў уключаны Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў у інвестыцыйную праграму Мінска. Паміж той лазняй 1954 года пабудовы і цяперашнім будынкам — дзве вялікія розніцы. І вы хутка самі зможаце ў гэтым пераканацца. Важна і тое, што абноўлены комплекс мае ўсе элементы безбар'ернага асяроддзя.



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Кіраўнік раённай адміністрацыі падзякаваў усім, хто быў задзейнічаны ў рэканструкцыі аб'екта за якасна праведзеную работу і павіншаваў прысутных з маючым адбыцца Днём Незалежнасці.

Працаваць комплекс будзе без выхадных: з 12.00 да 23.00 па буднях і з 8.00 да 23.00 па выхадных.

**Наталля ДРАЗДОВА.**

На дзяжурстве

# АДНА МАРА НА ДВАІХ

## Арцём і Таццяна БАСАЛАІ з дзяцінства хацелі служыць у міліцыі

**Здаецца, што ў летні перыяд, калі большасць мінчан з'язджае з горада, работы ў Дзяржаўнай аўтаінспекцыі павінна быць менш. Удзельнікаў дарожнага руху, сапраўды, не так шмат, але ці аблягчае гэта работу дарожнай міліцыі?! Летам ёсць свае нюансы: на дарогах часцей з'яўляюцца дзеці (многія, на жаль, без суправаджэння дарослых), па праспектах і вуліцах рэгулярна ганяюць матацыклісты, а апошнім часам тут трывала «прапісаліся» яшчэ і самакатчыкі...**

Каб на свае вочы пераканацца ў тым, што цяпер у супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі — гарачая пара, карэспандэнты «Звязды» выехалі з імі на дзяжурства. Наша патруляванне адбываецца ў самым вялікім раёне сталіцы — Фрунзенскім. Таму работы аўтаінспектарам хапае.

### НЕ ЗДРАДЗІЛІ МЭЦЕ

Разам з камандзірам узвода дарожна-патрульнай службы Дзяржаўтаінспекцыі Фрунзенскага РУУС сталіцы Арцёмам Басалаем мы едзем па гарадскіх вуліцах. Ніякіх парушэнняў правілаў дарожнага руху пакуль не заўважаем. Ёсць час пазнаёміцца.

Арцём Басалай нарадзіўся ў вёсцы Стайкі Івацэвіцкага раёна. Вясковы хлопец з дзяцінства марыў быць міліцыянерам. Пасля вучобы ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, ужо будучы дыпламаваным інжынерам лясной гаспадаркі, у чэрвені 2014 года малады чалавек прыйшоў у міліцыю. Паўгадавое навучанне ў вучэбным цэнтры Міністэрства ўнутраных спраў — і Арцём Басалай атрымаў доўгачаканыя лейтэнанцкія пагоны. Ён адразу трапіў у Дзяржаўтаінспекцыю. Пазней ажыццявілася і даўняя задумка — інспектар паспяхова скончыў Акадэмію МУС.

Дарэчы, мала хто ведае, што на выбар прафесіі Арцёма Басалая паўплывала не толькі дзіцячая мара, а і жонка. Таццяна Басалай таксама служыць у міліцыі. Спачатку працавала тут як грамадзянская асоба, потым атэставалася, цяпер яна — прапаршчык міліцыі. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, яна больш ні ў якай прафесіі сябе не ўяўляла, таму паступова набліжалася да сваёй мэты. І калі перад мужам стаяў выбар — ісці ў міліцыю ці не — адназначна настаяла на першым, бо і сябе без гэтай прафесіі ўжо не ўяўляла.

Цікавы факт: Арцём і Таццяна — родам з адной вёскі, нават вучыліся ў адным класе. Мала таго, што столькі часу яны заставаліся верныя адно аднаму, ды яшчэ і прафесію выбралі адну на дваіх.

### ГАЛОЎНАЕ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПРАВАПАРУШЭННЯ

Як на ліха (для мяне як рэпарцёра) і на шчасце, на дарогах, па якіх мы едзем з капітанам міліцыі Арцёмам Басалаем, — ціха і спакойна. Камандзір узвода дарожна-патрульнай службы расказвае, што парушэнні правілаў дарожнага руху апошнім часам у асноўным звязаныя з невыкананнем хуткаснага рэжыму кіроўцамі і непрытрымліваннем імі дыстанцыі паміж транспартнымі сродкамі. Пешаходы ж грэбуюць пераходамі, святлафорамі і перасякаюць праезную частку ў непрызначаных для гэтага месцах.

— Многія, і кіроўцы, і пешаходы, думаюць, што задача інспектараў дарожна-патрульнай службы — выключна пакараць удзельнікаў дарожнага руху: ці штрафам, ці больш сур'ёзнай адказнасцю, — гаворыць Арцём Басалай. — Аднак мала хто задумваецца, што ў першую чаргу мы працуем на прафілактыку: наша галоўная задача — не дапусціць правапарушэння.

Не ўсе ведаюць, што калі нешта (несур'ёзнае, вядома!) здараецца ў кіроўцы ці ў пасажыра ўпершыню, праваахоўнікі абмяжоўваюцца папярэджаннем. Безумоўна, гэта фіксуецца, таму разлічваць на рэгулярныя патуранні з боку супрацоўнікаў ДАІ не варта. Папярэджанне даецца для таго, каб чалавек у будучыні не здзяйсняў падобных правапарушэнняў.


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На прафілактыку працуюць і шматлікія акцыі, якія рэгулярна праводзяцца Дзяржаўтаінспекцыяй. Тымі днямі, напрыклад, калі мы «дзяжурылі» разам з Арцёмам Басалаем, праходзіла акцыя «Таксі». Супрацоўнікамі ДАІ быў узмоцнены кантроль за выкананнем правілаў дарожнага руху кіроўцамі, якія дзеля свайго заробку выкарыстоўваюць сродкі электрасувязі і інтэрнэт.

— Павышаная ўвага да кіроўцаў дадзеных сэрвісаў звязаная ў першую чаргу з тым, што апошнім часам фіксуецца вялікая колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам таксі, — тлумачыць капітан міліцыі. — Яны звязаныя як з праездам на забараняльны сігнал святлафора, так і з грэбаваннем правілаў дарожных знакаў і разметкі. Акрамя таго,



пачасціліся выпадкі ўдзелу ў дарожным руху таксістаў у нецвярозым стане.

А тым часам мы спыняемся каля аднаго з аўтамабіляў таксі. Інспектар дарожна-патрульнай службы просіць кіроўцу паказаць дакументы. Праверыўшы іх і адзначыўшы, што ўсё ў парадку, Арцём Басалай нагадвае таксісту аб элементарнай культуры паводзін на дарозе. Пасля прафілактычнай гутаркі мы працягваем сваё дзяжурства.

### У ЛЮБЫМ ДТЗ ВІНАВАТЫЯ АБОДВА

Праязджаем каля аднаго з аўтамабіляў, кіроўца якога размаўляе па тэлефоне. Інспектар падае спецыяльны сігнал — жанчына спыняе размову.

— Сучасныя тэхналогіі, у прыватнасці ўсялякія гаджэты, аказалі свой негатыўны ўплыў і на дарожны рух, — адзначае Арцём Басалай. — Якой колькасці аварый можна было б пазбегнуць, калі б кіроўцы аўтамабіляў не карысталіся гаджэтамі за рулём. Прычым гэта датычыцца і пешаходаў, якія не адрываюцца ад сваіх смартфонаў, нават калі пераходзяць дарогу альбо надзенуць навушнікі і ідуць, быццам навокал нікога няма. Аднак не трэба забываць — у любым дарожна-транспартным здарэнні вінаватыя два ўдзельнікі: адзін — больш, другі — менш.

Яшчэ адна праблема, якая найбольш актуальная ў летні перыяд, — дзеці на дарогах. І колькі б інспектары ні прыходзілі ў школы і ні тлумачылі, як сябе паводзіць на праезнай частцы, з году ў год сітуацыя застаецца напружанай. І як паказвае практыка, у дарожна-транспартныя здарэнні дзеці ў асноўным трапляюць тады, калі побач з імі няма бацькоў. Праваахоўнікі лічаць, што прыйшоў час удасканаліць заканадаўства і ў адносінах да веласіпедыстаў, самакатчыкаў, гіраскутарыстаў і тых, хто ездзіць на манаколах — на жаль, яны таксама рэгулярна становяцца ўдзельнікамі ДТЗ.

### ТЭЛЕФАНУЮЧЫ, ЛЮДЗІ РАЗЛІЧВАЮЦЬ НА ДАПАМОГУ

Як кіроўцу, мяне зацікавіла, хто часцей становіцца вiноўнікам дарожна-транспартнага здарэння: мужчыны ці жанчыны? «На гендарную прыкмету ўдзельнікаў ДТЗ сёння не варта звяртаць увагі, — лічыць супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі. — З вопыту скажу, што мужчыны-кіроўцы больш манеўраныя ў дарожным руху. Жанчыны ездзяць больш спакойна, аднак у іх менш хуткая рэакцыя».

З апошнім, дарэчы, жонка камандзіра ўзвода дарожна-патрульнай службы Дзяржаўтаінспекцыі Фрунзенскага РАУС можа паспрачацца. Яна як ніхто ведае, што часам хуткая рэакцыя чалавека можа выратаваць не адно жыццё. Таццяна Басалай працуе ў службе міліцыі 102. Гэта ў тым ліку яе голас мы чуем, калі набіраем адпаведны нумар.

— Калі да нас тэлефануе чалавек, часцей за ўсё ён чакае дапамогі, — гаворыць прапаршчык міліцыі. — Менавіта з аператыўна-дзяжурнай службы ўсё пачынаецца. Ад нашых дзеянняў многае залежыць: сабраўшы ўсю неабходную інфармацыю ад таго, хто патэлефанаваў, мы павінны як мага хутчэй зрэагаваць і максімум на працягу дзвюх хвілін накіраваць звесткі ў тое падраздзяленне міліцыі альбо ў іншыя структуры, у кампетэнцыі якіх дапамагчы чалавеку. А яшчэ важна наладзіць кантакт з тым, хто патэлефанаваў. Часта трэба быць тонкім псіхолагам. Работа ў нас вельмі адказная.

А неадказных людзей у міліцыі, напэўна, не існуе. І тое датычыцца не толькі прафесійных абавязкаў супрацоўнікаў МУС. Як правіла, гэта ў прынцыпе неабыякавыя людзі. Арцём Басалай, напрыклад, — актыўны донар крыві. Яшчэ са студэнцкай лаўкі раз на два месяцы інспектар дарожна-патрульнай службы здае кроў. Між іншым, яму не хапае ўсяго дзвюх кроваздач да звання ганаровага донара.

Традыцыі

# БЫЛЫХ НЕ БЫВАЕ

## Беларуская грамадская арганізацыя ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў адзначыла 30-годдзе

**Як той казаў, былых міліцыянераў не бывае. І ў гэтым можна было пераканацца падчас урачыстага сходу, прысвечанага 30-й гадавіне з моманту ўтварэння адной з вядучых грамадскіх арганізацый краіны, якая налічвае звыш 27 тысяч ветэранаў.**

Каля вытокаў яе стаялі міліцыянеры, якія прайшлі Вялікую Айчынную вайну. Менавіта на іх плячах ляжала задача па знішчэнні апошніх бандыцкіх фарміраванняў, якія не пакідалі ў спакоі і без таго пацярпелых і замучаных вайной беларусаў. Яны адны з першых разам з астатнімі неабыякавымі суайчыннікамі адраджалі разбураную фашыстамі краіну.

Сёння ў ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў — не менш важныя задачы. Прымнажаючы традыцыі папярэдніх пакаленняў, яны дзеляцца вопытам з тымі, хто нясе службу цяпер. Акрамя таго, арганізацыя аказвае дапамогу тым супрацоўнікам міліцыі, якія выйшлі на заслужаны адпачынак.

